311746'

# Беларуская мова 8 клас

## Дыктанты, пераказы, пераклады



Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў

*Пад рэдакцыяй П.А. Міхайлава*

Рэкамендавана ўстановай «Навукова-метадычны цэнтр вучэбнай кнігі і сродкаў навучання» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*2-е выданне*

Мінск
«Аверсэв»
2003

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ

УДК 808.26(075.3)
ББК 81.2Беи-922
Б43

*Аўтары:*
І. Л. Бурак, П. А. Міхайлаў, Т. А. Мытнік, Н. У. Чайка

Рэцэнзенты:
канд. філал. навук, дац. каф. рыторыкі і методыкі выкладання моў і літаратур Бел. дзярж. ун-та ***І. М. Саматыя***; настаўнік бел. мовы і літ-ры СШ № 2 г. Маладзечна ***Г. Ф. Гусева***

**Беларуская** мова: Дыктанты, пераказы, пераклады:
Б43 8 клас: Дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. шк., гімназій, ліцэяў/І. Л. Бурак, П. А. Міхайлаў, Т. А. Мытнік, Н. У. Чайка; Пад рэд. П. А. Міхайлава. — 2-е выд. — Мн.: «Аверсэв», 2003. — 224 с.
ISBN 985-478-208-5.

Дапаможнік прызначаны настаўнікам і навучэнцам школ, гімназій і ліцэяў для замацавання і ўдасканальвання сваіх ведаў па беларускай мове.

Раздзелы дапаможніка адпавядаюць асноўным навучальным тэмам праграмы агульнаадукацыйнай школы і падручнікаў для навучэнцаў 8 класа.

**УДК 808.26(075.3)**
**ББК 81.2Беи-922**

*Вучэбнае выданне*

**Бурак** Ірына Леанідаўна
**Міхайлаў** Павел Аляксандравіч
**Мытнік** Таццяна Аляксандраўна
**Чайка** Наталля Уладзіміраўна

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

**Дыктанты, пераказы, пераклады**

**8 клас**

Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў

*2-е выданне*

Адказны за выпуск *Дз. Л. Дзямбоўскі*

Падпісана ў друк з гатовых дыяпазітываў 24.07.2003. Фармат 84×108 1/32.
Папера друкарская № 2. Гарнітура «Школьная». Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 11,76. Ул.-выд. арк. 7,54. Тыраж 5100 экз. Зак. 166[illegible].
Пасведчанне № 08-33-0.156048
аб дзяржаўнай гігіенічнай рэгістрацыі прадукту ад 13.12.200[illegible].
Таварыства з дадатковай адказнасцю «Аверсэв».
Ліцэнзія ЛВ № 106 ад 25.07.2002. Кантактны тэлефон (017) 210-18-[illegible]8.
E-mail: info@aversev.com; www.aversev.com
Рэспубліка Беларусь, 220123, Мінск, М. Багдановіча, 129а.
Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
220013, Мінск, праспект Ф. Скарыны, 79.

ISBN 985-478-208-5
© Калектыў аўтараў, 2002
© Афармленне. ТДА «Аверсэв», 2002

## ПРАДМОВА

*Гэты дапаможнік прызначаны настаўнікам і навучэнцам школ, гімназій і ліцэяў для замацавання і ўдасканальвання сваіх ведаў па беларускай мове. Ён складзены ў поўнай адпаведнасці з дзеючай вучэбнай праграмай і падручнікамі па беларускай мове для 8 класа школ з рускай і беларускай мовамі навучання, а таксама з улікам «Адзінага моўнага і арфаграфічнага рэжыму школы» *.*

*Кніга складаецца з дзевяці самастойных раздзелаў: «Словазлучэнне», «Сказ», «Просты сказ: двухсастаўныя сказы», «Просты сказ: аднасастаўныя сказы», «Просты сказ: няпоўныя сказы», «Просты сказ: сказы з аднароднымі членамі», «Просты сказ: сказы са звароткамі, пабочнымі словамі і выклічнікамі», «Просты сказ: сказы з адасобленымі членамі», «Спосабы перадачы чужой мовы». Гэтыя раздзелы адпавядаюць асобным навучальным тэмам і размяшчаюцца строга ў паслядоўнасці, вызначанай вучэбнай праграмай і падручнікамі для навучэнцаў 8 класа.*

*Кожны асобны раздзел змяшчае тры віды пісьмовых прац — дыктанты, пераказы і пераклады, мэтанакіравана*

---

* Праграмы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з беларускай мовай навучання: Беларуская мова. V—XI класы. — Мн., 2000.

Праграмы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з рускай мовай навучання: Беларуская мова. V—XI класы. — Мн., 2000.

Антанюк Л. А., Бадзевіч З. І., Кныш М. К., Саматыя І. М. Беларуская мова: Сінтаксіс і пунктуацыя: Падручнік для 8 класа школ з беларускай мовай навучання. Выданне другое. — Мн., 2001.

Тамашэвіч Т. І. Беларуская мова: Падручнік для 8 класа школ з рускай мовай навучання. — Мн., 1999.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПРОСТЫ СКАЗ:
## СКАЗЫ З АДАСОБЛЕНЫМІ ЧЛЕНАМІ

## ДЫКТАНТЫ

### ПАПЕРАДЖАЛЬНЫ ДЫКТАНТ

#### Надыход вясны

Зямля пахне зямлёй, калі яе схопіць адразу сонца, калі вясна ідзе без слаты... Днём тады па вуліцы і па двары бягуць, шваргочучы, ручаі — вузенькія, маленькія, цераз іх, не баючыся, ступаюць куры; нанач яшчэ больш апагоджваецца, робіцца зусім чыстае неба; на захадзе, дзе схавалася сонца, гарыць чырвоная, як жар, зара, шырокая, на ўсю вёску. Пасля неба гусцее, робіцца цёмнае, як зімой, і ў ім загараюцца зоркі. У вёсцы з комінаў высока ўгару падымаюцца слупамі дымы — пахне прыгарэлай бульбай і альховымі дрывамі, — і ціха снуецца на Выганчыку па снезе туман, пойдзе ў вёску, блізка, аж на аселіцы. Цісне ноччу мароз. Скачуць нават зоркі, як зімой, і шчыпле за шчокі і за вушы; бялеюць ад інею бровы і каўнер у кажусе. Дарога адразу бярэцца лёдам: яе сякуць коні вострымі гакамі. Стукаюць сані палазамі, завальваючыся ў цвёрдыя, як камень, глыбокія з зімы калдобіны, па якіх днём бегла да ракі вада. (147 слоў)

*Паводле І. Пташнікава*



**ЗАДАННІ**

1. Знайсці ў тэксце адасобленыя акалічнасці, выражаныя дзеепрыслоўнымі словазлучэннямі.
2. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.

### КАМЕНЦІРАВАНЫ ДЫКТАНТ

#### Галя

Галя, светлавалосая дзяўчынка з кірпатым носам і вялікімі сінімі вачыма, была равесніцай Якімку. Яны разам пайшлі ў першы клас, разам селі за парту і неўзабаве падружыліся.

Пасля, ужо ў трэцім класе, іх прымалі ў піянеры. Яны з Галяй сталі побач у страі і давалі ўрачыстую клятву на вернасць Радзіме. Вялікім шчасцем ззялі сінія Галіны вочы, шчокі паружавелі. Якімка таксама быў шчаслівы як ніколі.

Неўзабаве Галю, выдатніцу і актывістку, выбралі старшынёй савета атрада. Весела, цікава стала ў іхнім класе. На перапынках яны гулялі ў розныя гульні, пасля заняткаў хадзілі ў лес, на луг і збіралі гербарыі раслін, калекцыі насякомых, мінералаў. А ўзімку бегалі на каньках, на лыжах. Нават летам, калі пачыналіся канікулы, атрад не распадаўся, як гэта было раней, на асобныя групкі. Разам хадзілі ў паходы па роднаму краю, у поле — дапамагаць дарослым. Разам чыталі цікавыя кніжкі, палілі піянерскія кастры на лясных палянах... (142 словы)

*Паводле Я. Курто*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці ў тэксце адасобленыя азначэнні. Падкрэсліць іх.
2. Вызначыць, чым яны выражаны.
3. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ТЛУМАЧАЛЬНЫ ДЫКТАНТ

### Незвычайнае падарожжа

Дзякуючы Жулю Верну, я рана пачаў вандраваць па свеце. Для гэтага не трэба было ні караблёў, ні цягнікоў, ні цягавітых мулаў. Хапала адной фантазіі. Пасля кожнай кнігі Жуля Верна я крочыў па тых самых сцежках, што і яго героі. Гэта было лёгка і ўдавалася ў любы час і ў любым месцы. Звычайная, тысячу разоў бачаная і зведаная вясковая вуліца магла стаць новай і незнаёмай, варта было толькі выключыцца з плыні паўсядзённага жыцця. Родныя бары і бярэзнікі ў залежнасці ад патрэбы маглі ператварацца ў трапічныя зараснікі ці ў сібірскую тайгу. Невялікая, паўзарослая асакой і аерам рачулка Змейка, якая пятляла па сенажаці за агародамі, рабілася то блакітным Нілам, то імклівай горнай ракой.

Гэта было цудоўна — вандраваць па свеце. Знікала ўсё дробязнае, будзённае, душа поўнілася радасцю адкрыцця, самаахвярнасцю падзвігу. У часы такіх вандровак забываліся ўсе крыўды і згрызоты, і я адчуваў сябе найвялікшым уладаром, які раздае людзям толькі радасць і шчасце. (148 слоў)

*Паводле І. Навуменкі*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці сказы з адасобленымі членамі.
2. Вызначыць, якімі часцінамі мовы яны выражаны.
3. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.

## ВОЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ

### Першы снег

Сівыя хмары неспакойна забегалі па небе, як кругі па вадзе. Падняўся вецер, густа і працяжна зашумеў стары лес на ўсе галасы. А хмары бягуць, сцелюцца ніжэй, гладчэй, раўней і аблягаюць усё неба. Пасыпаўся снег мільёнамі камячкоў дробнага, мяккага пуху. Залёталі, закружыліся яны халодным пылам.



А вецер крапчэе, уздзірае снег знізу ў полі, падымае яго ўгору, круціць стаўбамі, і белы віхар снежнага пылу далёка прамчыцца па полі. Свішча вецер, нясе белы пыл у кожны куточак, у кожную дзірачку, круціцца, налятае з усіх старон і ўсё, што ні сустрэне на сваёй дарозе, абсыпае халодным снегам. Неба мяшаецца з зямлёю. Усюды, куды ні глянь, бель і бель, і не можа вока абняць гэту белую сцяну.

А як заліваецца вецер у полі! Свішча ён у платах дзікім зверам, уздзірае саломеныя стрэхі, налятае на голыя адзінокія дрэвы, варочае кожную іх галінку, кожны сучок, і дрыжыць усім сваім целам беднае дрэва. (145 слоў)

*Паводле Якуба Коласа*

**ЗАДАННЕ**

Запісаць тэкст у вольнай форме, выкарыстоўваючы сказы з адасобленымі членамі.

### Свет чалавечай мудрасці

Францішку як, здаецца, і гадзін у сутках не ставала на вучобу. Часу заўсёды было мала. І адыходзіла ўбок, як нешта недарэчнае, вясёлая бурса са штукарствам калег, якія адзін перад адным вучыліся марнаваць час. Не дзеля гэтага дабіраўся Францыск Скарына з Полацка ў далёкі Кракаў. Перад ім адсланялася дарога ў непазнанае, у вялікі свет чалавечай мудрасці, назапашанай вось у гэтых тоўстых вялікіх кнігах, якіх тут, у Кракаўскім універсітэце, было шмат. Гэта былі сябры, пра якіх Францішак прачытаў у адным лацінскім трактаце: «Прыходзячы да іх, мы ніколі не застаём, каб яны спалі; калі ў іх пытаешся, яны думкі сваёй не тояць: не лаюць, калі ты памыляешся; не насміхаюцца з цябе, калі выявілася, што ты невук…» Сапраўды, так умеюць толькі кнігі… (118 слоў)

*Паводле А. Клышкі*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**ЗАДАННЕ**

Запісаць тэкст у вольнай форме, выкарыстоўваючы сказы з адасобленымі азначэннямі.

## ВЫБАРАЧНЫЯ ДЫКТАНТЫ

### Шчасце

Калі і быў Васіль шчаслівы, задаволены жыццём цалкам, то толькі ў самым раннім дзяцінстве, калі жылі яшчэ на Далёкім Лядзе. Там, адразу за іх агародам, нібы вежы, узвышаліся вялізныя дубы. Ён заўсёды, калі толькі хацеў, мог шуснуць з хаты пад дубы, пашукаць жалудоў або яблычкаў, якія нарасталі на дубовым лісці — іх сок імгненна сцягваў рану, калі абдзярэш руку ці праколеш нагу.

На сярэднім дубе была буслянка. Знізу яна нагадвала не вельмі ахайную кучу хворасту, усцягнутую ледзь не на самую макушку дуба, у развілак між верхнімі галінамі. Буслы сюды заўсёды прылягалі адны і тыя ж. Яны толькі злёгку рамантавалі гняздо, засціляючы дно яго новымі хварасцінкамі, і пачыналі сталае, да восені, жыццё. Суседзямі буслоў былі вераб'і — пяць-шэсць,а можа, нават болей іхніх, звітых з пырніку, сухіх сцяблінак, гняздзечкаў мясцілася між хварасцін па краях буслянкі. (133 словы)

*Паводле І. Навуменкі*

**ЗАДАННІ**

1. Выпісаць з тэксту сказы з адасобленымі акалічнасцямі.
2. Вызначыць, чым выражаны адасобленыя акалічнасці.
3. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.

### Папірусная кніга

Даўнейшыя папірусныя кнігі падобныя не да нашых сённяшніх, а да геаграфічных картаў, скручаных у трубку. Дарэчы, на продаж папірус таксама ішоў у вялікіх сувоях, а не ў аркушах. Там ужо яго адразалі



колькі каму трэба было. Найбольш цаніўся папірус якасных гатункаў — жаўтаваты або зусім белы. У меншай цане быў папірус карычневых адценняў.

Скруткі на кнігі былі звычайна каля дзесяці метраў. Чаму? Гэта тлумачыцца проста. Каб чытач, беручы кнігу, мог у адной руцэ трымаць скрутак, а другою раскручваць яго. Сувойчык у дзесяць метраў якраз меў дыяметр пяць-шэсць сантыметраў. Яго зручна было ўзяць у далонь.

У адным такім скрутку можна было запісаць прыкладна тысячу нашых радкоў. А каб запісаць вялікія паэмы старажытнасці «Іліяду» ці «Адысею» Гамера, на кожную трэба было каля дзесятка скруткаў. (121 слова)

*Паводле А. Клышкі*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці і выпісаць канструкцыі з адасобленымі членамі сказа.
2. Вызначыць, чым выражаны адасобленыя члены.
3. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.

## ДЫКТАНТ «ПІСЬМО ПА ПАМЯЦІ»

### Нёман

Страшэнны штукар і свавольнік гэты Нёман. Кожны год удзярэ ён якую-небудзь штуку: то вы-каціць на чый-небудзь шнур стары, мокшы вякамі ў вадзе, труп дрэва, то выхваціць цэлую луку ў адных і прыточыць другім або падрэжа грунт, на якім доўгімі вякамі стаяў асілак дуб у самай добрай згодзе з суседам Нёманам. Не знае стрымання ён, не ведае, куды дзець свае магутныя сілы. Але ніхто не жаліўся на яго свавольства. А ў нашым сяле яго надта любілі, бо ён для сяла быў, як родны бацька: і карміў, і паіў, і на сваіх плячах кожнага вынасіў.

Кожны крок Нёмана, кожны спад ці прыбыль вады ў ім не праходзілі незаўважанымі для сялян. А ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

апошнія гады Нёман задумаў новую шутку: у тым месцы, дзе бераг датыкаўся аднаго канца сяла, ён пачаў рабіць заварот, пракладаць новую дарогу, адразаючы шырокую луку да сяла. Прабегшы дугою побач з сялом, ён падыходзіў ужо да другога яго канца і далей бег старою дарогаю. (153 словы)

*Паводле Якуба Коласа*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці ў тэксце адасобленыя члены сказа і растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.
2. Завучыць дыктант і запісаць па памяці.

## ДЫКТАНТ «ПРАВЯРАЮ СЯБЕ»

### У Празе

Але, пэўна ж, Прага прыцягвала тым, што ў ёй ужо друкавалі кнігі на роднай мове чэхаў, што адсюль можна было наладзіць сувязь з такімі цэнтрамі еўрапейскага кнігадруку, як Нюрнберг, Аусбург, Венецыя.

А быў жа непачаты край работы. Апрача таго, што трэба было раздабыць шматлікія тэксты кнігі — рукапісныя стараславянскія, друкаваныя чэшскія, лацінскія, якія патрэбна было мець пры зверцы са сваім перакладам, — неабходна было адліць новыя, не лацінскія шрыфты, падшукаць кваліфікаваных друкароў, гравёраў, мець паперу.

Прага магла прыцягваць Скарыну і тым, што была цэнтрам перадавых ідэй. Чэшскі вучоны Здэнак Неедлы зазначаў: «Гусіцкая Прага перш за ўсё давала Скарыне паруку ў тым, што там ніхто не будзе чыніць яму перашкод з-за рэлігійных перакананняў». (110 слоў)

*Паводле А. Клышкі*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці ў тэксце адасобленыя члены сказа.
2. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку пры іх. Праверыць сябе.



## КАНТРОЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ

### Партызанскі лагер

Якімка аглядаў партызанскі лагер.

Раней, калі гаворка заходзіла пра жытло партызан, у яго ўяўленні чамусьці абавязкова паўставалі буданы, накрытыя яловымі лапкамі або саломай. А тут ніякіх буданоў не было. У засені векавых елак, тулячыся да цёмна-шэрых ствалоў з падцёкамі смалы, роўным радам цягнуліся зямлянкі. Збоку і з тылу яны зусім не падобныя былі на чалавечае жытло. Проста невысокія, прадаўгаватыя пагоркі, пакрытыя, як і ўвесь лес навокал, зялёным мохам. Толькі калі падысці да зямлянкі спераду, дык можна ўбачыць два невялікія, не больш ліста з вучнёўскага сшытка кожнае, акенцы і вузкія, як прайсці аднаму чалавеку, дзверы, да якіх спускаліся земляныя прыступкі.

Усярэдзіне зямлянак было даволі прасторна і пасвойму ўтульна. Ад дзвярэй аж да задняй сцяны вёў шырокі і глыбокі ход, такі, каб у ім маглі свабодна размінуцца двое і каб чалавек не згінаўся. Сцены, вышынёй усе з паўметра, былі з бярвення. На іх абапіраліся з двух бакоў плашкі. Гэта быў дах, які адначасова служыў і столлю. (154 словы)

*Паводле Я. Курто*

**ЗАДАННЕ**

1 в. — выпісаць з тэксту дапасаваныя адасобленыя азначэнні і вызначыць, чым яны выражаны.

2 в. — выпісаць з тэксту недапасаваныя адасобленыя азначэнні і вызначыць, чым яны выражаны.

### У Падуі

У Падую Скарына падаўся, каб паглыбіць свае веды ў медыцыне.

Так заўсёды на краявідзе яго жыцця віднеюцца кніга і дарога...

Скарына, бясспрэчна, мог атрымаць ступень доктара медыцыны і ў якім іншым універсітэце, бліжэй



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

да радзімы, скажам, там, дзе атрымаў ён годнасць доктара філасофіі. Куды бліжэй, чым далёкая Падуя, былі вядомыя універсітэты Германіі. Але, не зважаючы на тысячы кіламетраў, поўных невядомасці, небяспекі, выбіраецца юнак у Італію.

Яна, Італія, першая сярод краін Еўропы пазбавілася сну сярэднявечча. Развіваюцца рамёствы, гандаль, растуць гарады. Зараджаюцца новыя капіталістычныя адносіны. Вызваляючыся ад феадальнай залежнасці, чалавек адкрывае новыя для сябе каштоўнасці. Мянялася яго мысленне, адчуванне: не думкі аб збавенні душы, а новыя землі, далёкія падарожжы, жыццё з усёю раскошай палоніць, вабіць яго. Не хрысціянскае самаабмежаванне цэніцца цяпер у чалавеку, а прадпрымальнасць, адвага, практычнасць. (125 слоў)

*Паводле А. Клышкі*

**ЗАДАННЕ**

1 в. — выпісаць адасобленыя азначэнні і вызначыць, чым яны выражаны.
2 в. — выпісаць адасобленыя акалічнасці і вызначыць, чым яны выражаны.

## Бярозавы сок

Бацька ведаў, калі ўвесну можна браць сок. Тады ён асцярожна сякерай абсякаў замшэлую, бугорчатую кару. Нізка-нізка, каб пасудзіну можна было прыставіць да камля. Пасля ўстаўляў латок, па якім цэлы дзень цяклі, сыпаліся ў вядро або жбан светлыя, звонкія кроплі...

Маці мыла да жаўцізны цэбар і бочку, якія пастухова напаўняліся празрыстым, як крынічная вада, салодкім пітвом. Яго жбанамі насіў у каморку Федзя або сястра Гэля... Каб сок быў яшчэ смачнейшы, маці клала ў цэбар сухары, скарынкі хлеба, спечанага ў сваёй печы. Кідала яшчэ нейкую духмяную прыправу і абавязкова — накрышаную дубовую кару. Калі згусцелы верхні слой у цэбры рабіўся бела-аксамітным, яна сеяла туды ячмень або авёс... Ён узыходзіў белымі шыльцамі. Тады



маці адчыняла акно ў цёмнай каморцы, каб гэтыя шыльцы паглядзелі на святло, на сонца ды ўзяліся густымі пер'ямі... Пад светла-зялёнай рунню адстойваўся бурштынавы мацунак... Аж да касьбы і жніва... (140 слоў)

*Паводле І. Грамовіча*

**ЗАДАННЕ**

Выпісаць з тэксту сказы з дзеепрыметнікамі. Растлумачыць, чаму ў адных выпадках яны адасабляюцца, у другіх — не.

## Школа

Ідучы па вуліцы, Міхась, сямігадовы хлопчык, не раз затрымліваўся каля аднаго дома ў сяле. Ён быў шмат большы і вышэйшы за нізенькія сялянскія хаткі і быў накрыты не саломаю, як усе будынкі, а гонтамі. Высокі ганак на тоўстых круглых слупах значна выступаў ад даху наперад і таксама быў накрыты гонтамі. Вялікія, светлыя вокны прыветна глядзелі на вуліцу. А над вокнамі, недзе не каля самага даху, была прыбіта невялікая дошка з нейкім малюнкам — ні то зверам, ні то птушкаю з дзвюма галовамі. На дошцы стаялі нейкія значкі роўненькім радочкам. Што гэта былі за значкі, Міхась не ведаў. Казалі, што гэта літары. Іх можа разбіраць толькі той, хто будзе хадзіць у гэты дом, а дом той завецца школай, і літары гэтыя азначаюць цэлае слова. І Міхась усякі раз, як праходзіў каля школы, чуў у сабе нейкі страх, бо маці не раз яго страшыла гэтаю школаю, як ён часам пачне залішне гуляць у хаце. (151 слова)

*Паводле Якуба Коласа*

# ПЕРАКАЗЫ

◇ ◇ ◇

Даліна ляжала між шасэ і ракою. З аднаго боку гула мутная жаўтаватая плынь Стрыя, з другога —



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Змест


*Прадмова* .............................................. 3

**СЛОВАЗЛУЧЭННЕ**

ДЫКТАНТЫ .............................................. 7

Папераджальны дыктант .............................................. 7
Каменціраваны дыктант .............................................. 8
Творчы дыктант .............................................. 9
Вольны дыктант .............................................. 9
Дыктант «Пісьмо па памяці» .............................................. 10
Дыктант «Правяраю сябе» .............................................. 11
Выбарачныя дыктанты .............................................. 12
Кантрольны дыктант .............................................. 12

ПЕРАКАЗЫ .............................................. 13

ПЕРАКЛАДЫ .............................................. 20

Пераклад-пераказ .............................................. 29

**СКАЗ**

ДЫКТАНТЫ .............................................. 33

Папераджальныя дыктанты .............................................. 33
Каменціраваныя дыктанты .............................................. 34
Тлумачальны дыктант .............................................. 36
Вольны дыктант .............................................. 37
Дыктанты «Пісьмо па памяці» .............................................. 37
Дыктант «Правяраю сябе» .............................................. 39
Выбарачны дыктант .............................................. 40
Кантрольныя дыктанты .............................................. 40

ПЕРАКАЗЫ .............................................. 42

ПЕРАКЛАДЫ .............................................. 49

Пераклад-пераказ .............................................. 50

**ПРОСТЫ СКАЗ:** двухсастаўныя сказы

ДЫКТАНТЫ .............................................. 53

Папераджальны дыктант .............................................. 53
Каменціраваны дыктант .............................................. 54
Тлумачальны дыктант .............................................. 54
Творчыя дыктанты .............................................. 55
Вольныя дыктанты .............................................. 56
Выбарачныя дыктанты .............................................. 60





Дыктант «Пісьмо па памяці» .............................................. 61
Дыктант «Правяраю сябе» .............................................. 62
Кантрольныя дыктанты .............................................. 63

ПЕРАКАЗЫ .............................................. 66

ПЕРАКЛАДЫ .............................................. 74

**ПРОСТЫ СКАЗ:** аднасастаўныя сказы

ДЫКТАНТЫ .............................................. 91

Папераджальны дыктант .............................................. 91
Каменціраваныя дыктанты .............................................. 92
Тлумачальны дыктант .............................................. 93
Творчы дыктант .............................................. 94
Вольны дыктант .............................................. 94
Выбарачны дыктант .............................................. 95
Дыктант «Пісьмо па памяці» .............................................. 96
Дыктант «Правяраю сябе» .............................................. 97
Кантрольныя дыктанты .............................................. 97

ПЕРАКАЗЫ .............................................. 99

ПЕРАКЛАДЫ .............................................. 107

**ПРОСТЫ СКАЗ:** няпоўныя сказы

ДЫКТАНТЫ .............................................. 109

Папераджальны дыктант .............................................. 109
Каменціраваны дыктант .............................................. 110
Дыктант «Пісьмо па памяці» .............................................. 110
Дыктант «Правяраю сябе» .............................................. 111
Кантрольныя дыктанты .............................................. 112

ПЕРАКАЗЫ .............................................. 113

ПЕРАКЛАДЫ .............................................. 119

**ПРОСТЫ СКАЗ:** сказы з аднароднымі членамі

ДЫКТАНТЫ .............................................. 121

Папераджальныя дыктанты .............................................. 121
Каменціраваныя дыктанты .............................................. 123
Тлумачальны дыктант .............................................. 124
Творчыя дыктанты .............................................. 125
Вольны дыктант .............................................. 126
Выбарачныя дыктанты .............................................. 127
Дыктант «Пісьмо па памяці» .............................................. 129
Дыктант «Правяраю сябе» .............................................. 129
Кантрольныя дыктанты .............................................. 130

ПЕРАКАЗЫ .............................................. 132

ПЕРАКЛАДЫ .............................................. 140





РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ПРОСТЫ СКАЗ: сказы са зваpоткамі, пабочнымі словамі і выклічнікамі


ДЫКТАНТЫ ........................................................ 146

Тлумачальны дыктант ........................................ 146
Вольныя дыктанты ............................................ 147
Выбарачны дыктант ........................................... 149
Дыктант «Пісьмо па памяці» ............................ 149
Дыктант «Правяраю сябе» ................................. 150
Кантрольны дыктант .......................................... 151

ПЕРАКАЗЫ ......................................................... 152

ПЕРАКЛАДЫ ...................................................... 157


## ПРОСТЫ СКАЗ: сказы з адасобленымі членамі


ДЫКТАНТЫ ........................................................ 162

Папераджальны дыктант ................................... 162
Каменціраваны дыктант .................................... 163
Тлумачальны дыктант ....................................... 164
Вольныя дыктанты ............................................ 164
Выбарачныя дыктанты ...................................... 166
Дыктант «Пісьмо па памяці» ............................ 167
Дыктант «Правяраю сябе» ................................. 168
Кантрольныя дыктанты ..................................... 169

ПЕРАКАЗЫ ......................................................... 171

ПЕРАКЛАДЫ ...................................................... 179


## СПОСАБЫ ПЕРАДАЧЫ ЧУЖОЙ МОВЫ


ДЫКТАНТЫ ........................................................ 192

Папераджальныя дыктанты .............................. 192
Каменціраваны дыктант .................................... 193
Творчы дыктант ................................................ 194
Вольны дыктант ................................................ 195
Выбарачны дыктант .......................................... 195
Кантрольны дыктант ......................................... 196

ПЕРАКАЗЫ ......................................................... 197

ПЕРАКЛАДЫ ...................................................... 204

Пераклады-пераказы ........................................ 206


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ